# ДАТА ЗАСНАВАННЯ ГРОДНА ЯК ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧАЯ ПРАБЛЕМА

**Крыніца друкавання:**
*Дата заснавання Гродна як гісторыка-краязнаўчая праблема [Электронны рэсурс] // Harodnia.com. – Рэжым доступу:* https://harodnia.com/be/uczora/starazhytny-horadzien/56-data-zasnavannia-hrodna. *– Дата доступу: 26.06.2017 г.*

*Многія гарадзенцы заблыталіся. Святкаваць 880-цігоддзе горада пачалі ў гэтым 2007-м годзе. А на Палацы тэктыльшчыкаў вісеў плакат з шарыкаў – Гродно, 1128 год. Дык калі з'явілася (а дакладней, калі была ўпершыню згадана ў летапісах) Горадня?*

*Аказваецца дакладна ў 1127 годзе. Чыноўнікі проста не хочуць занадта "загружацца" і выбралі кампрамісны варыянт. Прапануем артыкул Алеся Пятровіча Госцева, з якога вы даведаецеся, чаму Горадзен згаданы быў упершыню менавіта ў 1127 годзе. Гораду ўжо 880-год.*

За апошнія 25 гадоў наш горад некалькі разоў адзначаў свае юбілеі, а ў 1978 і 2003 годах нават рабіў гэта ўрачыста. І кожны раз святкаванне прыпадала на юбілейныя даты ад 1128 года. Плануецца святкаванне 880-годдзя Гродна і ў 2008 годзе. Пры гэтым за апошнія дзесяцігоддзі ў навуковай літаратуры, асабліва ў літаратуры энцыклапедычнага кшталту, замацоўваецца летапісная дата заснавання Гродна – 1127 год [6-10; 14]. Такое разыходжанне не можа заставацца па-за ўвагай даследчыкаў і павінна разгледжвацца як пэўная праблема. На першы погляд праблема гэта чыста гістарычная, але гісторыя як навука ў нашым выпадку аказваецца на раздарожжы, застапарыўшыся на звестках Іпацьеўскага летапісу. І тут ёй на дапамогу павінна прыйсці краязнаўства з яго здольнасцю разгледжваць любую рэгіянальную з'яву цэласна, асаблівую ўвагу пры гэтым надаючы менавіта "дробязям". Справа ў тым, што большасць гісторыкаў добра валодаюць сістэмным мысленнем, але зусім (ці амаль зузім) не валодаюць методыкай цэласнага мыслення. Пры ўсіх сваіх станоўчых якасцях (вельмі добра праяўляўшых сябе яшчэ гадоў 25-30 таму), сістэмнае мысленне мае адзін, але вельмі істотны недахоп: яно абмежавана канкрэтнай сістэмай і таму не ў стане ўхапіць рэальную з'яву ва ўсёй яе разнастайнасці, цэласна. Апошняе даецца толькі цэласнаму мысленню. Асноўны прынцып цэласнага падыходу: пры вывучэні (аналізу) любой з'явы - выкарыстоўваць набыткі як мага большай колькасці навуковых дысцыплінаў. І менавіта ў гэтым напрамку краязнаўства ўжо мае пэўныя поспехі. Але толькі пры

ўмове, што пад краязнаўствам разумеецца цэласная сістэма, базавае палажэнне якой: цэлае - значна большае, чым простая сума асобных, складаючых яе частак. Краязнаўчы падыход да працы з крыніцамі патрабуе кіравання наступнымі прынцыпамі:

1. Максімальны давер толькі першакрыніцы на якой бы мове яна не была створана - і гэты давер не стопрацэнтны, асабліва, калі канкрэтная звестка сустракаецца толькі аднойчы (у такім выпадку звестка з'яўляецца не фактам гісторыі, а гістарычным фактам і толькі прымаецца да ведама, бо маецца ў наяўнасці менавіта такая падача факта); фактам гісторыі звестка становіцца па меры яе падцверджання іншымі першакрыніцамі (як рэчавымі так і пісьмовымі). Такім чынам факт гісторыі (ФГ) (у дадзеным выпадку гісторыя разумеецца як рэчаіснасць) - дакладна вядомая звестка аб нейкай канкрэтнай гістарычнай падзеі, ці яе даціроўкі, ці імёнах, лёсах асоб, якія з гэтай падзеяй звязаны і да т.п., а гістарычны факт (ГФ) (тут гісторыя разумеецца як навука) - звестка, зафіксаваная ў гістарычных крыніцах і адлюстроўвае (з той ці іншай ступенню дакладнасці) факт гісторыі.

2. У праявах рэчаіснасці няма дробязяў, тут усё істотна.

3. Любая з'ява разгледжваецца ўсебакова, з максімальнамагчымых і разнастайных пунктаў погляду. Гэты прынцып злучаецца з першым прынцыпам, што ўтварае надзвычай дынамічны і дзейсны цыкл прынцыпаў, дзякуючы якому з'ўляецца магчымасць спасцігнуць сутнасць з'явы. Наколькі такая магчымасць здзейсніцца, залежыць ад асабістых здольнасцяў даследчыка: яго назіральнасці, памяці, цэласнасці яго мыслення. Калі прымяніць гэтыя прынцыпы да вырашэння нашай праблемы, то атрымецца рэальная спроба пераўтварэння гістарычных фактаў аб пачатковай гісторыі Гродна ў канкрэтны факт гісторыі – дакладную даціроўку першага пісьмовага згадвання нашага горада. Яшчэ з 19 стагоддзя шырока вядома, што Гродна ўпершыню згадваецца як Горадзен, чый князь Усевалад быў пасланы на полацкія землі вялікім кіеўскім князем разам з трыма іншымі князямі. У 19 - пачатку 20 стагоддзя былі вядомыя па меншай меры два летапісы – Іпацьеўскі і Лаўрэнцьеўскі, у якіх згадваецца гэтая падзея. Я. Ф. Арлоўскі ў сваёй працы “Гродненская старина” падкрэслівае гэта, звяртаючы ўвагу на розначытанні і нават упэўнена прагаворвае 1127 год як канкрэтны год першага згадвання [16, с. 10, 20]. У другой палове 20 ст. да патрэбных нам першакрыніц далучыўся Радзівілаўскі летапіс. Паколькі і зараз нямала даследчыкаў грэбаюць сцвярджэннем Я.Ф. Арлоўскага, праведзем самастойны аналіз, на гэты раз трох летапісных крыніц.

З трох летапісаў два (Радзівілаўскі і Лаўрэнцеўскі) падаюць згаданую намі падзею пад 6635 годам, а трэці летапіс (Іпацеўскі) пад 6636 годам. Ужо гэта вымушае нас больш пільна прыгледзецца да зместу гэтых звестак.

Лаўрэнцеўскі летапіс:

"6635. В то же лето посла князь Мстиславъ братью свою на кривиче четырми пути. Вячеслава ис Турова, Андрея из Володимеря. А Всеволодка из Городна. И Вячеславъ Ярославича ис Клечьска. Тем повеле ити къ Изяславлю."

Іпацеўскі летапіс:

"6636... Того же лета посла князь Мстиславъ с братьею своею многы кривичи четырьми путьми: Вячеслава ис Турова, Андрея из Володимеря, а Всеволодка из Городна... тем повеле ити къ Изяславлю ... рекъ им динъ день всим пустити на вороп мца августа 11 дня... 6640"

Радзівілаўскі (Кенігсбергскі) летапіс:

"6635... в то же время пасла князь Мстиславъ братию свою на кривичи четырми пути: Вячеславъ ис Турова, Андреа из Володимеря, а Всеволодка из Городна, и Вячеславъ Ярославича ис Кляцка. Тем повеле ити и ко Изяславлю ... рек им: "Во одинъ день всем пустити на воропъ, августа 14."

Параўнаўшы паміж сабою тры тэксты, прыходзім да высновы, што першы і трэці тэксты разыходзяцца толькі ў няістотных дэталях (пры поўным супадзенні з датай), затое другі тэкст адрозніваецца ад дзвух першых настолькі істотна, што зводзіць сэнс звесткі амаль да поўнага абсурду. Мяркуйце самі, агульнавядома (і гэта бяспрэчны факт гісторыі), што крывічамі называлі ў 12 ст. насельнікаў Полацкай зямлі, якая ў той час не падпарадкоўвалася Кіеўскаму князю - таму натуральна, што той загадаў напасці ("пустити на вороп"="удариться в набег") "на кривиче". А што можа значыць фраза з Іпацьеўскага летапісу "... посла князь Мстиславъ с братьею своею многы кривичи четырьми путьми ..."? Калі гэта не памылка перапісчыка (тут трэба даволі добра ведаць абставіны стварэння летапісаў: Іпацеўскі летапіс значна маладзейшы за Лаўрэнцеўскі: ён датуецца пач. 15 ст.; Лаўрэнцеўскі летапіс, датуеца 1377 г., а Радзівілаўскі, хоць і датуецца канцом 15 ст., але даследчыкі адзначаюць, што ён адпавядае Лаўрэнцеўскаму летапісу), то атрымліваецца нейкая бязглуздзіца накшталт таго што вялікі князь кіеўскі разам з "братьею своею" паслаў варожых яму крывічаў на "все четыре стороны"... Для нас жа важна тое, што такія "дробязі", разам з даціроўкай падзеі годам пазней значна змяншаюць давер да сапраўднасці гэтага запісу. Але толькі змяншаюць, не адмаўляючы яго цалкам. Чаму? Па-першае, у цэлым гэты летапіс заслугоўвае статус першакрыніцы, а па-другое, ёсць цудоўнае тлумачэнне рознач ытанню даты нашай падзеі. Гэтае тлумачэнне дае нам дапаможная дысцыпліна храналогія, згодна якой існуе паняцце каляндарных стыляў у сэнсе пачатку года. Калі год у найстаражытнейшыя часы пачынаўся з 1 сакавіка, то такі каляндарны стыль і сам год называецца сакавіцкім. Калі ў пазнейшыя часы пачатак года змяніўся і год пачынаўся з 1 верасня, то такі каляндарны стыль і сам год называецца вераснёўскім. Першыя старажытнарускія летапісы ствараліся яшчэ па

сакавіцкаму стылю, а пазнейшыя (звычайна самая старажытная частка іх перапісвалася пазнейшымі перапісчыкамі) - па вераснёўскаму стылю. Перад перапісчыкам уставала неабходнасць перадатаваць падзею з сакавіцкага на вераснёўскі стыль. А паколькі верасень знаходзіцца якраз пасярэдзіне паміж дзвума сакавікамі (ад 1 сакавіка да 1 верасня і ад 1 верасня да 1 сакавіка па шэсць месяцаў), то перапісчык мог пазначаць вераснёўскую дату адной і той жа падзеі ці паўгодам раней ці паўгодам пазней (у апошнім выпадку каляндарны стыль называецца ультрасакавіцкім). Згодна гэтаму вызначаецца формула перакладу даты ад стварэння свету на дату ад нараджэння Хрыста (летапісы датуюць свае падзеі ад стварэння свету і лічыцца, што з "моманту" стварэння свету да моманту нараджэння Хрыста прайшло 5508 гадоў). Агульнавядомая формула перакладу дат НХ=СС-5508 (дзе НХ - год ад нараджэння Хрыста, СС - год ад стварэння свету). Менавіта яна выкарыстоўваецца ў выпадках, калі летапісная падзея датуецца сакавіцкім стылям. Для выпадку ультрасакавіцкага стылю храналогія прапануе некалькі іншую формулу: НХ=СС-5509. Згодна такой логіцы 6635 год перакладаецца такім чынам 6635-5508=1127. І калі тая ж самая падзея ў іншым летапісу датуецца годам пазней, то адзінае лагічнае тлумачэнне (але пры ўмове спалучэння некалькіх летапісаў): гэты запіс датаваны ультрасакавіцкім стылям і тады правільны пераклад: 6636-5509=1127.

Ёсць выпадкі, калі сітуацыя з гэтым запісам даходзіць да яшчэ большага абсурду: сам паход датуецца 1127 годам, а дата заснавання Гродна (якая традыцыйна вынікае з гэтага паходу) адзначаецца як 1128. За прыкладам далёка хадзіць не трэба. “Толькі ў Іпацеўскім і Густынскім летапісах агульнарускі паход на Полацк значыцца пад 1128 г. (дакладней – пад 6636 г. – А.Г.), ва ўсіх жа астатніх, у тым ліку і ў найбольш раннім (падкрэслена намі – А.Г.) Лаўрэнцеўскім, - пад 1127 (дакладней – пад 6635 г. – А.Г.). Улічваючы гэта, трэба прызнаць большую праўдзівасць датыроўкі ў астатніх крыніцах, хоць Л. Аляксееў палічыў патрэбным прытрымлівацца Іпацеўскага летапісу, не ўлічваючы яго дэфектыўнасці ў шэрагу месцаў і вельмі лаканічнага выкладу гэтых падзей у Густынскім летапісе”. Цытуецца па кнізе: Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Полацкі і новагародскі перыяды.- Мн.: Мастацк. Літар., 1990, с. 174). У сваю чаргу М.Ермаловіч сцвярджае: “Як сведчыць Іпацеўскі летапіс, у Новагародку (1235), у Гародні (1128) і інш.), Ваўкавыску (1256), і Свіслачы (1256) былі свае князі” [13, с. 22].

Як бачым, цэласны падыход дае нам найбольш верагодную дату заснавання Гродна - 1127 год і дазваляе да таго ж пазбегнуць шматлікіх недарэчнасцяў і бязглуздзіц. Застаюцца яшчэ вельмі цікавыя пытанні. Напрыклад, чаму шэраг навукоўцаў і ў мінулым і сучаснасці працягваюць упарта прытрымлівацца даты 1128 год і ігнараваць храналогію? Але гэта трохі іншая тэма даследвання.

Такім чынам, мы яшчэ раз пераканаліся, што калі ўзятыя паасобку і гістарычныя факты і факты гісторыі не ў стане дакладна вызначыць праблему, то пры арганічным спалучэнні паміж сабою яны здольныя стварыць цэласную мадэль пэўнай рэчаіснасці і такім чынам з дастатковай ступенню дакладнасці сцвердзіць канкрэтны факт гісторыі.

Літаратура


1. ПСРЛ Т. І. Лаврентьевская летопись.- М., 1962.

2. ПСРЛ Т. 2. Ипатьевская летапись.- СПБ, 1843.

3. ПСРЛ Т. 2. Ипатьевская летапись.- СПБ, 1908.

4. ПСРЛ Т. 38. Радзивиловская летопись. - Наука: Л., 1989.

5. Літопис руський за Іпатським списком. Пер. Л. Махновец.- Київ: Дніпро, 1989.

6. Беларускія летапісы і хронікі: пер. са старажытнарускай, старабеларускай і польск. /Уклад. У. Арлова; прадм. В. Чамярыцкага.- Мн.: "Беларускі кнігазбор", 1997.- 452 с.

7. Гродна//Беларуская энцыклапедыя у 18 тамах. Т. 5.- Мн.: БелЭ, 1997.- с. 442-446.

8. Гродна//Беларусь. Энцыклапедычны даведнік.- Мн.: БелЭ, 1995.- с. 249-250.

9. Госцеў А. Гродна//Энцыклапедыя гісторыі Беларусі у 6 тамах. Том 3.- Мн.: БелЭ, 1996.- с. 147-154.

10. Иллюстрированная хронология истории Беларуси. От древних времен до наших дней. 3-е изд.- Мн.: БелЭ, 2002.- 464 с.

11. Соловьев А.В. Новые раскопки в Гродне и их значение для русской истории//Записки русского научного института в Белграде. Вып. 13.- Белград, 1936.- с. 69-96.

12. Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Полацкі і новагародскі перыяды.- Мн.: Мастацк. Літар., 1990.

13. Ермаловіч М. Беларуская дзяржава Вялікае княства літоўскае.- Мн.: Беллітфонд, 2000.- 322 с.

14. Госцеў А., Швед В. Кронан. Летапіс горада на Нёмане(1116-1990).- Гродна: НВК "Пергамент", 1993. - 320 с.

15. Госцеў А.П. Калі быў заснаваны горад Гродна і якое ён меў імя ў летапісны перыяд (матэрыялы да метадычнай распрацоўцы краязнаўчых заняткаў)//Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 9.- Гродна: ІПК, 2002.- с.

16. Орловский Е.Ф. Гродненская старина. Часть І. Гор. Гродно.- Гродно: Губерн.тип., 1910.- 341 с.